20. ЦДАВО України. – Ф. 1072. – Оп. 1. – Спр. 28.
21. ЦДАВО України. – Ф. 3984. – Оп. 3. – Спр. 223.
22. ЦДАВО України. – Ф. 3984. – Оп. 4. – Спр. 52.
23. ДАЗО. – Ф. Р-316. – Оп. 3. – Спр. 17.
24. ДАЗО. – Ф. Р-316. – Оп. 3. – Спр. 188.
25. ЦДАВО України. – Ф. 3984. – Оп. 3. – Спр. 254.
26. ЦДАВО України. – Ф. 3984. – Оп. 3. – Спр. 159.
27. ЦДАВО України. – Ф. 3984. – Оп. 3. – Спр. 243.

**Summary**

The social and political processes and their influence on Orthodox Church in South Ukraine in the beginning 20-th of XX century were analyzed in the article.

***М. П. Касцюк***

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА – УКРАІНСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА: НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ШЛЯХУ І ЎЗАЕМААДНОСІН

Пасля падзення царызму ў Расійскай імперыі ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у многіх месцах найбольш актуальнай стала праблема нацыянальнага самавызначэння. Шматгадовае панаванне самадзяржаўя на Украіне і ў Беларусі таксама высунула гэтую задачу на першы план. Актывізацыя дзейнасці грамадскіх сіл у першую чаргу адбывалася ў звязку з гэтым напрамкам.

Характэрнай асаблівасцю памкненняў многіх прадстаўнікоў беларускага і ўкраінскага народаў да дзяржаўнага самавызначэння ў гэты час стала такая форма дзяржаўнага ўладкавання як народная рэспубліка. Нельга не звярнуць увагу на падабенства данных назваў у Беларусі і на Украіне – Беларуская Народная Рэспубліка і Украінская Народная Рэспубліка. Гэта – не выпадкова. Тут і гістарычныя традыцыі, і ў многім агульны лёс абодвух народаў, пастаўленыя мэты і стасункі паміж сабою тых, хто меў сваёй неардынарнай задачай дасяганне дзержаўнай незалежнасці ў новых палітычных абставінах.

Скіраваная на гэта дзейнсць пачыналася ўжо ва ўмовах пачатку праўлення Часовага ўраду, які хоць і працягваў у многіх адносінах ранейшую царскую знешнюю і ўнутраную палітыку, але тым не менш знізіў ціск і рэгламентацыю грамадска-палітычнага жыцця ў цэнтры і на месцы. Таму заканамерна, што ў нацыянальных ускраінах, у тым ліку на Беларусі і ва Украіне, актывізаваўся нацыяальны рух, удасканальвалася яго арганізацыя, канкрэтызаваліся задачы.

У Беларусі да Лютаўскай рэвалюцыі была колькі адна арганізацыя з нацыянальнай скіраванасцю – Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад выйны. Пасля звяржэння царызму ён аб’явіў сябе нацыянальным каміўтэтам. Па яго ініцыятыве 25-27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Асноўны вынік яго працы – аднаўленне дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады і стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК).

Аднак арганізацыя беларускіх нацыянальных сіл праходзіла са значнымі цяжкасцямі, нягледзячы на небывалую дэмократыю, прыўнесеную Лютаўскуй рэвалюцыяй у грамадскае жыццё. Органы кіравання Часовага ўраду, саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, іншыя фарміраванні былі індыферэнтныя ці нават варожыя да беларускай нацыянальнай справы. Асабліва негатыўна да яе ставілася камандаванне і салдацкія камітэты Заходняга фронту [1, с.45,78,87]. Яго шматлікі асабовы склад накладваў моцны адбітак на грамадска-палітычнае жыццё беларускага краю.

Тым не менш, па ініцыятыве Беларускай сацыялістычнай грамады 8-10 кастрычніка 1917 г. у Мінску прайшоў новы з’езд беларускіх партый і арганізацый. Згодна з яго рашэннем Белнацкам быў ліквідаваны і створаны новы каардынацыйны орган – Цэнтральная рада беларускіх арганізацый. На яе другой сесіі, што адбылася 15-25 кастрычніка гэтага ж года, быў сфарміраваны новы орган для каардынацыі нацыянальнага беларускага руху – Вялыкая беларуская рада (ВБР). Асноўную ролю ў ёй ігралі Беларуская сацыялістычная грамада, а таксама Беларуская народная грамада і Беларускі абласны камітэт, які ўзнік у лістападзе 1917 г. пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў.

Беларуская народная грамада, у якой важную кіруючую ролю выконваў А.Цвікевіч, аб’ядноўвала беларускія арганізацыі ў Расіі, на Украіне і ў іншых месцах. У верасні і лістападзе 1917 г. яна правяла два свае з’езды ў Маскве.

Арганізацыйныя захады па нацыянальна-тэрытарыяльнай прыкмаце мелі месца і ў арміі. З'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту, што адбыўся 18-24 кастрычніка 1917 г. у Мінску і ў якім прынялі ўдзел прадстаўнікі Паўночнага і Румынскага франтом, а таксама Балтыйскага флоту, ўтварыў Цэнтральную беларускую вайсковую раду – ЦБВР. Яе асноўнай задачай з'езд прызнаў утварэнне беларускага войска [1, с.140], што ў той час з'яўлялася крайне неабходным.

Прыкладна ў такім жа напрамку, але з меншымі цяжкасцямі па прычыне больш высокай этнічна-гістарычнай свядомасці народа ішла арганізацыя нацыянальных сіл і на Украіне. Пасля актыўнай падрыхтоўчай працы адразу па завяршэнны Лютаўскай рэвалюцыі, у ходзе якой было вырашана фарміраваць кааліцыйны орган з прадстўнікоў усіх нацыянальных арганізацый [2, с.134], ужо 7 сакавіка 1917 г. адбыліся выбары кіруючага ядра Цэнтральнай рады, што стала часам яе стварэння [3, с.217]. Узначаліў Раду вядомы гісторык, нацыянальны і грамадскі дзяяч М. Грушэўскі. Пры гэтым ставілася перайсці ад культурна-асветных задач да палітычных. Яны заключаліся ў досягненні нацыяльна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Украіны. 19 сакавіка 1917 г. у Кіеве адбылася грандыёзная, 100-тысячная маніфестацыя. Яна стала кульмінацыяй адраджэння нацыянальна-вызваленчага руху [4, с.75].

Вялікая ўвага ў гэтых абставінах надавалася правядзенню Усеўкраінскага нацыянальнага кангрэсу. Ён адкрыўся 6 красавіка 1917 г. у Кіеве. На ім прысутнічалі 900 дэлегатаў ад розных украінскіх палітычных, грамадскіх, культурна-асветных, прафесійных арганізацый. З'езд зрабіў важныя зрубі ва ўсталяванні нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Украіны. Першым крокам на гэтым шляху стала прыняцце 1-га Універсала Украінскай цэнтральнай рады. У пачатку ліпеня гэтага ж года Рада прыняла другі Універсал, які прадугледжваў далейшы рух да нацыяльнай незалежнасці [5, с.211-215].

Такім чынам, ужо ў 1917 г., ва ўмовах праўлення Расійскага Часовага ўраду, на Украіне былі зроблены важныя крокі па дасягненню дзяржаўнага самавызначэння на нацыянальнай аснове. Падобны працэс, колькі з некаторым адставаннем, як адзначана вышэй, адбываўся і на Беларусі. У першу чаргу гэтыя зрубі ў абодвух народаў былі скіраваны на нацыянальную незалежнасць і ўтварэнне замест безымянных у часы царызму Паўночна-Заходняга і Паўднёва-Заходняга краёў адпаведна Беларускай і Украінскай народных рэспублік.

Але падзеі ва Украіне ў гэтых адносінах развіваліся больш імкліва, чым на Беларусы. Ужо 27 кастрычніка 1917 г. Украінская цэнтральная рада прыняла рэзалюцыю, у якой гаварылася аб неабходнасці перадачы улады «у рукі ўсёй рэвалюцыйнай дэмакратыі». Меркавалася таксама распрацаваць праект канстытуцыі Украіны, па якой яна, аднак, ўяўляла б сабою складовую частку федэратыўнай Расійскай дзяржавы. 7 лістопада 1917 г. Украінская цэнтральная рада прыняла 3-цы Універсал, дзе было сказана аб стварэнны Украінскай Народнай Рэспублікі, якая аб'яўлялася ў федэратыўнай сувязі з Расійскай дзяржаваю.

Значыць, стварэнне Укранскай Народнай Рэспублікі адбылося яшчэ ва ўмовах праўлення Часовага ўраду, да кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе, да захопу ўлады бальшавікамі. Гэты час, ад Лютаўскай да Кастрычніцкай рэвалюцый, кіраўнікі нацыянальна-дэмакратычных сіл Украіны, выкарысталі ў поўнай меры, эфектыўна і вынікова. Гэта было зроблена яшчэ да прынацця савецкімі органамі і аб'яўлення «Дэкларацыі правоў народаў Расіі» і «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатеемага народа».

На Беларусі прцэс нацыянальнага самавызначэння развіваўся некалькі маредней, хаця адразу пасля бальшавіцкага узброенага выступлення ў Петраградзе, 27 кастрычніка 1917 г. Вялікая беларуская рада звярнулася з граматай да беларускага народа і заклікала ўсе жывыя сілы да абароны свабод, якія заваяваны крывёю мільёнаў сыноў абражанай Беларусі. Гэты зварот быў падтрымамы іншымі беларускімі нацыянальнымі партыямі, арганізацыямі, рухамі.

Абставіны прыспешвалі і ужо ў канцы 1917 г. адбылася важная падзея на шляху станаўлення, умацавання, развыцця беларусукага нацыянальнага руху і працэсу дзяржаўнага самавызначэння. Гэта – Першы Усебеларускі з'езд (кангрэс), які адкрыўся ў Мінску 14 (27) снежня 1917 г. Ён быў надзвычай прадстаўнічым органам. У яго працы прынялі ўдзел 1872 дэлегаты, з якіх 1167 мелы права рашаючага голаса, астатнія – дарадчы. Тыя ўдзельнікі кангрэса, якія надтрымлівані Вялікую Беларускую раду, выступалі за незалежную Беларускую рэспубліку. Дэлегаты, сарыентаваныя на Беларускы абласны камітэт, адстойвалі знаходженне Беларусі ў складзе Расіі. Аднак праекты рэзалюцый, унесеныя ВБР і БАК, з'ездам не былі прынятыя [6, с.92-93]. Было адобрана кампраміснае рашэнне аб неадкладным стварэнны органа краёвай улады – Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем [7, с.105]. Яму даручалася падрыхтаваць і склікаць Устаноўчы сход для вызначэння дзяржаўнага ладу на Беларусі. Але сфарміраваўшы Раду

старэйшын (раду з’езда), з’езд быў разагнаны па рашэнню СНК Заходняй вобласці і фронту. Такім чынам, з’езд фактычна падышоў да пытання аб арганізацыі ўлады на Беларусі.

Разгон з’езда быў балюча ўспрыняты нацыяльна свядомымі жыхарамі як унутры Беларусі, так і за ея межамі. Асабліва рашучыя пратэсты ішлі ад прадстаўнікоў беларускага народа, якія знаходзіліся на Украіне. Так, з’езд воінаў-беларусаў Паўднёва-Заходняга фронту, што адбыўся 17-22 снежня 1917 г. у Кіеве ў прынятай рэзалюцыі, перададзенай у выглядзе радыётэлеграмы, запатрабаваў вызвалння арыштаваных дэлегатаў Першага Усебеларускага з’езда і прыцягнення да адказнасці тых, хто гэта зрабіў.

Абраны Першым Усебеларускім з’ездам Савет лічыў сваім грамадзянскім абавязкам працягваць пачатую справу. Ужо на наступны дзень, 18 (31) снежня 1917 г., на яго закрытым пасяджэнны была прынятая пастанова, у якой канстатаваўся: лічыць Першы Усебеларускі з’езд гвалтоўна разагнаным. Савет з’езда аб’яўляўся выканаўчым органам для правядзення ў жыццё ўсіх рашэнняў і пастаноў з’езўда. Тады ж быў сфарміраваны рабочы орган − Выканаўчы камітэт Першага Усебеларускага з’езда. Яму было даручана ўзяць уладу ў свае рукі, калі гэта стане магчымым. Камітэт утварыў Раду Народнай Рэспублікі. У яе ўвайшлі сябры Выканаўчага камітэта і прадстаўнікі органаў беларускага самакіравання.

Аднак становішча на беларускай тэрыторыі з’яўлялася такім, што яна была разарваная фронтам на дзве часткі. Паўсюдна назіралася імкненне да самавызначэння на нацыянальнай аснове. Таму ў студзены 1918 г. Выканаўчы камітэт Савета з’езда і Беларуская Рада ў Вігьні пасля ўзгаднення паміж сабою пазіцый, обнародавалі сумесную заяву. У ёй яны прйшлі да вываду аб неабходнасці стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пасля таго, як савецкія войскі ў выніку германскага наступлення пакінулі Мінск, Выканаўчы камітэт Савета Першага Усебеларускага з’езда зрабіў захады да ўсталявання ў горадзе сваёй улады. 21 лютого 1918 г. ён звярнуўся да беларускага народа з 1-ай Устаўной граматай, дзе аб’явіў сябе часоваю ўладоай Беларусі, прыступіўшай да кіравання краем. Быў створены выканаўчы орган − Народны сакратарыят [8, с.301], у які ўвайшлі прадстаўнікі сацыялістычных партый. Фактычна з 18 па 25 лютага сакратарыят быў адзінай уладай на Беларусі [9, с.482-485].

Імкненне да дзяжаўнага самавызначэння атрымала замацаванне ў 2-ой Устаўной грамаце да народаў Беларусі, якая была выдадзена 9 сакавіка 1918 г. У данным дакуменце Беларусь а’бвяшчалася Народнай рэспублікай. На яе тэрыторыі былі аб’яўвлены свбоды слова, друку, сходаў, забастовак, сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, права на нацыянальна-персанальную аўтаномію, раўнапраўе моваў усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі на беларускай тэрыторыі. Было падверджана права прыватнай уласниці на зямлю. Яна без викупу передавалася тым, хто яе апрацоўваў. Нетра зямлы, яе воды і аб’яўляліся ўласнасцю БНР. Паўсюдна ўстанаўліваўся найбольшы 8-гадзінны працоўны дзень. У развыццё гэтага працэсу 3-яя Устаўная грамата Рады БНР ад 25 сакавік 1918 г. аб’яўляла Беларускую Народную Рэспубліку незалежнаю і вольнаю дзяржаваю [8, с.301].

Усё гэта адбывалася ў своеасаблівых умовах нямецкай акупацыі. Адносіны кіруючых органаў Беларускай Народнай Респубікі з германскай ваеннай адміністрацыяй былі складанымі. Яна не прызнавала ўладу Народнага сакратарыяту. Лепш нават сказаць, не давала яму аніякай улады. У той жа час акупацыйныя прадстаўнікі не лічылі магчымым учыніць якое-небудзь насілле над тымі, хто быў абраны Першым Усебеларускім з’ездам і імкнуўся выконваць яго наказы.

У гэтых абставінах урад БНР працягваў дабівацца падтымкі з боку германскіх уладаў, а таксама рабіў захады па міжнароднаму прызванню аб’яўленай беларускай дзяржаўнасці. Важным напрямкам ў гэтым з’яўлялася выкарыстанне пэўных магчымасцей, якія меліся ў суседняй Украіне. Таму ў Кіеў да германскага пасла накіравалася прадстаўнічая дэлегацыя ў складзе А. Цвікевыча, М. Доўнар-Запольскага, М. Трамповіча. Яна мела на мэце дабівацца прызнання самастойнасці Бўеларусі, устанавіць кантакты з мясцовай германскай адміністрацыяй з мэтай схіліць ўлады да згоды на стварэнне беларускіх узброеных сіл. Побач з гэтай дзейнасцю 18 красівка 1918 г. дэлегацыя адправіла з Кіева радыётэлеграмы ўрадам еўрапейскіх краін. У ёй паведамлялася аб сутнасці падзей, якія адбыліся на Беларусі. Пры гэтым было заяўлена, што з часу абвяшчэнне сваёй дзяржаўнай незалежнасцы беларускі народ не прызнае тых артыкулаў Брэсцкага мірнага дагавору, заключанага 3 сакавіка 1918 г., якія адносяцца да яго тэрыторыяльных інтарэсаў.

Але нягледзячы на пэўныя стасункі ўзаемаадносіны паміж кіруючымі органамі Беларускай і Украінскай народных рэспублік складваліся няпроста. Гэта праявілася ў час кантактаў паміж адказнымі беларускімі прадстаўнікамі і украінскімі ўладамі. Урад УНР, як сведчыць удзельнік і знаўца тых падзей, вядомы гісторык М. Доўнар-Запольскі, хаця і выказаў прыхільнасць да беларускага дзяржаўнага ўтварэння праявіў разам з тым шэраг ваганняў і пачаў выказваць

прэтэнзіі на некаторыя тэрыторыі з паўднёвай часткі Беларусі [9, с.485-488]. Пры гэтым адцягвалася вырашэнне дамоўленасцей адносна матэрыяльнай падтрымкі ўрада БНР.

Імкнучыся пераадолець такія акалічнасці, беларуская дыпламатычная місія адстойвала тэрытарыяльную цэласнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, нават змагла дабіцца пасылкі ў паўднёвыя беларускія паветы ўкраінскіх камісараў з ліку ўраджэнцаў Беларусі. Прабывання ў Кіеве беларуская дэлегацыя выкарыстала таксама і для таго, каб звярнуцца ў траўні 1918 г. да прадстаўніка Расійскага савецкага ўраду Ракоўскага, які тады знаходзіўся на Украіне, з мэтаю перадаць праз яго намеры па ўстаўляванню адносін з савецкай Расіяй.

Характэрна, што для рэгулявання гандлёвых узаемаадносін паміж Беларуссю і Украінай у Кіеве быў створены асобны орган. Фактычна яго функцыі выконвала Беларуская гандлёвая палата. У яе ўваходзілі вядомыя беларускія дзеячы − Доўнар-Запольскі, Базарэвіч, Бургак. Канчатковаю мэтаю гэтых захадаў было заключэнне гандлёвага дагавору.

Аб'яўленне Беларускай Народнай Рэспублікі выклікала рэзананс за межамі яе этнічнай тэрыторыі, у першую чаргу сярод прадстаўнікоў беларускага народа, якія там знаходзіліся. Актыўна рэагавалі тыя з іх, хто быў у гэты час на Украіне. Калі ў Адэсе стала вядома пра абвяшчэнне БНР, агульны сход беларусаў горада і яго ваколіц прыняў 21 красавіка 1918 г. рэзалюцыю, у якой заявіў, што беларускі народ валодае правам на сваю дзяржаўнасць таму што ўяўляе сабою асобную нацыю, мае сваё гістарычнае мінулае і сваё геаграфічнае становішча. Пры гэтым канстатавалася, што вырагаванне беларускага народа і яго свабоднае існаванне як нацы магчўыма колькі ў адзінстве. Таму абвяшчэнне Беларусі самастойная рэспублікай дасць магчымасць устанавіць у краіне парадок адпаведна мясцовым умовам і асаблівасцям беларускага народа. У рэзалюцыі віталася аб'яўленне БНР і выказвалася ўпэўненасць у вырашэнні цяжкіх і адказных задач, якія стаяць перад беларускім народам.

Працягам данай пазіцыі стала стварэнне ў Адэсе Камітэта па нацыянальных беларускіх справах. Ён імкнуўся праводзіць працу сярод беларускай дыяспоры, якая налічвала ў тых месцах да 100 тыс. чалавек. Значную яе частку складалі воіны-беларусы. Настой быў такім, што 4-ы армейскі корпус і Шаўрогінскі коны былі аб'яўлены беларускімі [9, с.490-492].

Між тым гэтыя і іншыя напрамкі ў беларуска-украінскіх узаемаадносінах ускладняліся тымі працэсамі, якія адбываліся ў Беларусі і на Украіне. Няпростым было становішча не колькі Беларускай, але і Украінскай народных рэспублік. У першую чаргу, гэта абумоўлівалася тым, что нямецкія ўлады як на Беларусі, так і на Украіне ставіліся да іх падазрона. Да таго ж адказнасць за акупацыю ўкраінскіх зямель грамадскасць Украіны ўскладвала на дзеячоў УНР. Гэта адбывалася насуперак таму, што яе кіраўнікі ў сваіх выступах гаварылі аб «бескарыслівай дапамозе дружелюбнай германскай дзяржавы».

Падобныя абвінавачванні прад'яўляліся негледзячы на тое, што ўрад Украінскай Народнай Рэспублікі імкнуўся праводзіць сваю эканамічную палітыку, у тым ліку вырашаць аграрнае пытанне. Ужо ў студені 1918 г. ім быў прыняты даволі радыкальны зямельны закон. У яго асное лажаў прынцып сацыялізацыі зямлі. Як высветлілася, данным законам у рэшце рэшт былі незадаволены як некаторыя пласты ўкраінскага сялянства, так і акупацыныя нямецкія і аўстра-венгерскія ўлады.

Сваёй мэты аграрная рэформа ўрада Украінскай Народнай Рэспублікі не дасягнула. Многія бяднейшыя сяляне не сталі на шлях яе падтрымкі. Ва ўсялякім разе ўкраінскім гісторыкам не ўдалося выявіць якіх-небуць пэўных сведчанняў пра акцыі незаможных сялян аб актыўнай палітычнай падтрымцы УНР на працягу 1918 г. У той жа час можна сцвярджаць, што праяваў шырокага незадавальнення палітыкай яе ўрада ў гэты час таксама не назіралася.

Аднак крайне непапулярным ва ўкраінскім народзе стаў гападарчы дагавор ад 23 красавіка 1918 г. паміж урадам Украінскай Народнай Рэспублікі, з аднаго боку, і Германіяй, а таксама Аўстра-Венгрыяй, з другога. Ён прадугледжваў пастаўкі ў дадзеныя краіны значнай колькасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Гэта моцна падарвала пазіцыі ўрада УНР ва ўкраінскім нўародзе. Вынікам такога становішча стаў дзяржаўны пераварот 29 красавіка 1918 г., калі да ўлады прыйшоў гетман П.Скарападскі [5, с.232-234]. Але гетманшчына як форма дзяржаўнага праўлення пратрымалася нядоўга, уступіўшы месца Дырэкторыі. Яе дзейнасць, як і ўраду УНР, нягледзячы на пастаянную змену месцаў прабывання, з'яўлялася выніковай па шэрагу напрамкаў, аб чым сведчаць многія дакументы [10].

Важным, прынцыповым дасягненнем стала стварэнне узброеных сіл, якія вялі баявыя дзеянні як супроць савецкіх, так і нарэдка супроць польскіх войскаў. Больш таго, у траўны-чэрвені 1919 г. удалося рэарганізаваць армію УНР на рэгулярнай аснове. Гэта дапамагло ёй паспяхова весці аперацыі, у у тым ліку нарэдка разам з польскімі войскамі супроць фарміраванняў Чырвонай арміі.

Тым не менш абставіны вакол Украінскай Народнай Рэспублікі ўскладняліся і ў лістападзе 1919 г. яе палітычны дзеячы і прадстаўнікі іншых грамадскіх сіл вымушаны былі прыйсці да высновы, што стварэнне самастойнай украінскай дзяржаўнасці нерэальна. Нягледзячы на такое рашэнне, працягвалася далейшае збліжэнне з Польшчаю. 28 красавіка 1920 г. аб'яднаныя ўзброеныя сілы Польшчы і УНР перайшлі ў наступленне супроць Чырвонай арміі. 6 траўня гэтага ж года яны авалодалі Кіевам. У наступны час развівалася пачатае нступленне. Аднак контрнступ Чырвонай арміі летам 1920 г., а затым ея паражэнне пад Варшавай прывялі ў рэшт да мірных перамоў.

Фактычна Украінская Народная Рэспубліка праіснувала каля 4 гадоў. За гэты час у поўны голас было заяўлена пра імкненне Украіны да сваёй нацыянальнай незалежнасцы, утварэння дзержаўнасці, самавызначэння. Такая пазіцыя праявіўлася як ва ўкраінскім грамадстве, так і ў працэсе ўнутранай і знешнепалітычнай дзейнасці ўрада УНР.

Такое ж імкненне было і ў Беларусі. Аднак яго сацыяльная аснова з'яўлялася меншай. Арыентацыя на савецкую Расію ці неактыўная грамадзянская пазіцыя былі вызначальнымі рысамі шэрагу пластом беларускага грамадства, у першую чаргу сялянства. Тым не менш нацыянальна арыентаваўныя дзеячы, падтрымліваючыя іх партыі і рухі настойліва дабіваліся вырашэння пастаўленых задач, дасягнення вызначаных мэтаў па стварэнню дзяржаўнасці беларускага народа.

Кіруючыя органы Беларускай Народнай Рэспублікі знаходзіліся ў Мінску да заняцця яго савецкімі войскамі ў канцы 1918 г. За гэты час, нягледзачы на нямецкую акупацыю, ім удалося правенці значную працу ў адукацыйным і культурна-асветным напраўмках. У наступныя гўады, знаходзячыся ў эміграцыі, яны працягвалі дзейнасць, асабліва знешнепалітычную.

Рэхам змагання за незалежную Беларусь стала Слуцкае паўстанне, якое адбылося ў апошнія месяцы 1920 г. Беларускую Раду Случчыны падтрымлівала ваеннае фарміраванне ў некалькі тысяч чалавек. Гэта была беларуская брыгада, «аўперыраваўшая супроць бальшавікоў». Баявыя дзеянні з часцямі Чырвоный арміі вяліся з канца лістапада і ахапілі некалькі тыднаў [11, с.1313; 12, с.9-10]. Толькі ў кастрычніку 1925 г. на Берлінскай канферэнцыі было заяўлена аб роспуску ўрада БНР.

Унутраная і знешнепалітычная дзейнасць Украінскай і Беларускай Народных Рэспублік, несумненна, з'явіліся значнымі вехамі ў развіцці нацыянальна-вызваленчага руху, імкненны нацыянальна-арыентаваных дзеячаў і часткі ўкраінскага і беларускага грамадства да самавызначэння на уласнай аснове. Гэта садзейнічала актывізацыі работы па стварэнню і развіццю Украінскай і Беларускай савецкіх рэспублік як свое асаблівай формы дзяржаўнага ўладкавання.

**Літаратура**


1. Станіслав Рудовіч. Час выбару. Проблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. – Мінск, 2001.
2. Солдатенко В.Ф. Українська революція. Історичний нарис. – К., 1999.
3. Українська Центральна Рада: документи і матеріали у двох томах. – Т. 2. – К., 1997.
4. Верстюк В. Українська Центральна Рада. – К., 1997.
5. Історія України. – К., 2002.
6. Гісторыя Беларусі. У 6-ці тамах. – Т. 5: Беларусь у 1917-1945 гг. – Мінск, 2006.
7. Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. – М., 1921. – Приложение 15.
8. История Беларуси в документах и материалах. – Минск, 2000.
9. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1994.
10. Директорія, Рада Народних Міністрів Української Народної Республіки. Листопад 1918 – листопад 1920 рр.: Документи і матеріали: у 2-х т. – К., 2006.
11. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. У 2-х кнігах. Т. 1. Кн. 2. – Вільня-Нью-Ёрк-Менск-Прага. – 1998.
12. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах. – Мінск, 2006.


**Summary**

This problem hardly has been investigated in Soviet historiography. Rare mentions of it in historical literature and other humanities were made in an utterly negative sense, though the representatives of BPR and UPR struggled for what we possess now – independent sovereign states in Byelorussia and Ukraine. The prominent splash of publications devoted to the subject (mostly in Ukrainian historiography, but in Byelorussian as well) has become possible only within the connections with geopolitical processes in the end of $80^{th}$ – beginning of $90^{th}$.